Наталля Заяц

**“Найцяжэйшая траса – да сэрцаў людскіх...”:**
**Штрыхі да творчага партрэта Рамана Тармолы-Мірскага**

У 1965 годзе Раман Тармола напісаў радкі, якімі ўскосна акрэсліў напрамак сваёй далейшай творчай дарогі: *“Век дваццаты пракладвае новыя трасы / Па зямлі і па небе – да зорак нямых, / І бядуе наш век, што да гэтага часу / Найцяжэйшая траса – да сэрцаў людскіх”*[1]. Шукаць шлях да людскіх сэрдцаў Р. Тармола пачаў студэнтам, падчас вучобы на гісторыка-філалагічным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута, куды паступіў пасля заканчэння школы ў старадаўнім Міры. Пазней у шматлікіх творах ён прызнаецца ў любові да мясцін маленства і ў знак яе нават возьме літаратурны псеўданім “Мірскі”. Нягледзячы на спробы пісаць вершы яшчэ ў школьныя гады, усвядоміў сябе паэтам Р. Тармола падчас студэнцкай паездкі ў 1958 годзе на цаліну, у казахстанскія стэпы. “Адкрытыя, як сэрца друга, бяскрайнія, як любоў да Радзімы”[2], яны напаўнялі сэрца беларускага хлопца такімі пачуццямі, перадаць якія найлепш і найдакладней магла мова паэзіі. Цалінныя землі сталіся месцам літаратурнага нараджэння не толькі юнака з Міра: аддтуль прывёз першую кніжку “Маладзік над стэпам” (1959) на год старэйшы за яго Р. Барадулін. У адрозненне ад свайго равесніка Р. Тармола не малюе карцін чужой прыроды і будатрадаўскіх будняў, а выказвае ўражанні ад іх апасродкавана: ранняя лірыка поўніцца аптымізмам маладосці, насычана яркімі запамінальнымі вобразамі. На шчырасць і адкрытасць твораў маладога аўтара звярнула ўвагу літаратурная крытыка, падкрэсліваючы іх жыццясцвярджальны пафас. Прынамсі, А. Лойка адзначаў, што ў вершах, якія ўвайшлі ў першыя кнігі Р. Тармолы “Асколкі і росы” (1964) і “Поўня” (1966), пераважае “нейкая нястрыманая віталістычная стыхія захаплення жыццём, дзеяннем, нават сузіраннем”[3]. Р. Тармола нібы імкнецца спыніць і занатаваць хутказменлівыя малюнкі і адчуванні, выступае песняром прыроднай стыхіі – вясновага капяжу, цёплых ліпеньскіх ліўняў, сонечных вераснёвых дажджоў:

*Верасы...*
*Верасы...*
*Шчасця голас разносіць бор двойчы, тройчы.*
*Б’юць зялёнымі кроплямі буйнай расы*
*Верасы*
*Па каленях тугіх, дзявочых.*
*А дзяўчына хутчэй і хутчэй бяжыць.*
*У вачах расінка іскрыцца.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Напрасткі ляцяць па касым дажджы*
*Дзве нагі, як дзве бліскавіцы*. (7)

"Дождж верасовы"

Часта замалёўкі з жыцця навакольнага свету і чалавека ствараюцца праз нечаканыя вобразы і асацыяцыі, здзіўляюць сваёй парадаксальнасцю. Так, лядовы каток у мастацкім уяўленні Р. Тармолы паўстае касмічным акіянам, у якім *"галоўнае – не стукнуцца з метэарытам. / Ім – кожны навічок з'яўляецца"* ("На катку"); вясновае абуджэнне прыроды ўспрымаецца як вайна зіме – са стралянінай і салютаваннем зялёных пупышак ("Справядлівая вайна"). Паэт "збліжае рознапланавыя рэчы і з'явы, напрыклад, з'явы прыроды і з'явы маральнага, сацыяльнага раду, прыводзячы іх да агульнага "назоўніка" – вобраза"[4].

Неардынарнасць мыслення, імкненне ўразіць выявілася таксама ў эксперыментах з формай верша – гульні з рыфмай, абыгрыванні сугучных слоў: "*Кап, кап, кап, кап – / Капля маленькая капала, капала, / Нібы казала: / Каб, каб / Стала я раптам такою, як камбала, – / Хутка вясна прыйшла б"* (21). У 1960-я гады Р. Тармола актыўна і настойліва шукаў сваю сцежку, выпрацоўваў уласны творчы почырк. І пошукі давалі добры плён – нараджаліся вершы, што сведчылі пра арыгінальнае свежае ўспрыняцце, уменне стварыць выразны зрокавы малюнак і патрэбны настрой, спалучыць пачуццё і думку. Адным з лепшых пацверджанняў гэтаму з'яўляецца верш "Грузавікі сена возяць...": "*Грузавікі сена возяць. / Паўзуць, як мядзведзі зялёныя, з раніцы. / Вечарам касцоў на свае спіны возьмуць / І ледзь-ледзь цягнуцца. / Сена сухое, сена лёгкае, / Стома касцоў важкая. / Ля вёскі машыны загудуць з палёгкаю: / Дома не так цяжка"* (29 – 30). Дзякуючы ўдала знойдзенаму вобразу, ёмкім у сваёй сэнсавай і экспрэсіўнай выразнасці штрыхам-дэталям, аўтар у таямнічым, нават фантастычным арэоле паказвае звычайны летні вечар, паэтызуе сялянскую працу і побыт.

Р. Тармола любуецца з'явамі штодзённага жыцця, узводзіць іх у ранг неверагоднага, захапляецца па-новаму ўбачанай і нібы ўпершыню заўважанай прыгажосцю ("Дзень патухае...", "Коні", "Беларускія базары"). Дарэчы, крытыкі нярэдка папракалі яго за апісальніцтва некаторых вершаў, якое, магчыма, і сапраўды мела месца на пэўным этапе творчасці, аднак было псіхалагічна матывавана. Засяроджанасць паэта на знешняй прыгажосці, сузіранні свету можа ўспрымацца як своеасаблівы пратэст супраць варожасці і небяспекі, што кожную хвіліну падсцерагалі Р. Тармолу і яго літаратурных равеснікаў Я. Сіпакова, А. Вярцінскага, Г. Бураўкіна і інш. у "абпаленым вайной" маленстве. Перажытае тады паклала адбітак на ўспрыняцце паэтам сучаснасці: па словах Л. Гарэлік, "сумленне, працоўная годнасць, маладосць, каханне, сяброўства, адносіны да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыроды – усе гэтыя духоўныя каштоўнасці вывяраюцца аўтарам у суаднесенасці з гераічнай памяццю народа”[5].

*“Колькі ў сэрцы нянавісці, гневу колькі / Да страшэннай вайны – праз жыццё пранясу, / Не прымаць каб дзецям расу за асколкі / І асколкі – за ранішнюю расу”* (10), – прызнаваўся Р. Тармола ў “Баладзе пра асколкі і росы” з першага зборніка. Гэты твор – водгук на адзін з самых трывожных эпізодаў ваеннага дзяцінства – бамбёжку роднага мястэчка Міра ў час адступлення нямецкіх войскаў: “Жах, які скалануў дзіцячае нутро, панарамна праплыў і прад вачамі дваццацігадовага юнака, – расказвае паэт у аўтабіяграфічнай нататцы “Памяць”. – І ўзрушанаму сэрцу нічога не заставалася, як толькі вынесці гэтыя няўмольныя кадры на белы экран паперы”[6]. У баладзе Р. Тармола ўзнаўляе тую раніцу, калі *“жалезныя птахі”* з крыжамі на крылах ператварылі *“ясны ранак”* з *“трапяткімі вясёлкамі”* ў найдаўжэйшую ноч, засыпалі празрыстую расу чорнымі асколкамі. Адабраная радасць маленства, растаптанае сямейнае шчасце выліліся ў нянавісць да вайны, абвастрылі мастакоўскае пачуццё адказнасці за будучыню, якое з цягам часу не знікае і не паслабляецца, а становіцца яшчэ больш моцным. Так, у вершы “Каля сцяны расстрэлу”, напісаным амаль праз паўстагоддзя пасля Перамогі, Р. Тармола ўсклікае: *“Не ўспамінайце вайну... / Не забывайце вайну!”* (336). Згадкі пра неспакойнае дзяцінства знайшлі мастацкае ўвасабленне ў вершах розных гадоў, а таксама паэмах “Навальнічны раён”, “Хатынскі рэквіем”, “Пакланіся агню” – “ваенная” тэма стала скразной у творчасці Р. Тармолы. Пры яе раскрыцці паэт, падобна да калегі па пяру Я. Сіпакова, вельмі часта звяртаецца да баладнага жанру (напрыклад, “Балада пра яблыню”, “Нямая балада”, “Завейная балада”, “Балада аб адной сям’і”). У аснову твораў пакладзены востра драматычныя падзеі. Аўтар малюе жорсткія ў сваёй рэалістычнасці карціны –“паляванне” самалёта за дзецьмі, забойства бацькі на вачах у сям’і, катаванне фашыстамі юнака, – якія павінны ўздзейнічаць на чытача ад супрацьлеглага: прывіць непрынятце насілля над чалавекам, нагадаць пра *“жах вайны, / Каб вайны зусім не ведаць”* (322).

Р. Тармола-Мірскі падкрэслівае, што нягледзячы на перажытае ў ваенны час, народ не страціў спагады, міласэрнасці і дабрыні. Лірычны герой верша “Палонныя”, назіраючы за *“доўгаю бясконцаю калонай”* учарашніх катаў, здзіўляецца паводзінам землякоў і ўласным адчуванням:

*Думаў я: кідаць каменнем буду*
*У забойцаў і рабаўнікоў...*
*А жанчыны падаюць ім бульбу*
*Ды маўчанне страшнае з бакоў...* (360)

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Высокім узорам уседаравальнасці і чалавекалюбства ў гэтым і многіх іншых творах Р. Тармолы-Мірскага паўстае жанчына – Маці і Каханая. Самаахвярнай ахоўніцы і абаронцы сваіх дзяцей, матулі Р. Тармола прысвяціў самыя прачулыя лірычныя радкі. Маці, Дамініка Іванаўна, не толькі падаварaвала будучаму паэту жыццё, але і неаднойчы ў час ваеннага ліхалецця захіляла яго ад смерці: "*Колькі разоў мяне выратоўвала / Мама, памерці сама гатовая"* (16). У аўтабіяграфіі Р. Тармола ўзгадвае трагічны (на жаль, не адзінкавы для яго пакалення) выпадак з дзяцінства, калі на супрацьтанкавай гранаце падарвалася пяцёра гарэзаў-аднагодкаў. А ён "заліваўся слязамі ад таго, што маці нечакана апынулася на вуліцы, схапіла за руку, не дала разам з усімі бегчы на першы выбух..."[7] Не думаў у той момант дзесяцігадовы хлапчук, што ўсё жыццё будзе з удзячнасцю ўспамінаць пра гэтыя слёзы.

Маці Р. Тармолы рана памерла, але, нават пакінуўшы гэты свет, яна засталася для сына найлепшым памочнікам і сябрам ("Да маці", "Партрэт"). З гадамі паэт усё больш разумее, што не паспеў сказаць ёй галоўнага, не зрабіў нечага важнага:

*Я перастаў саромецца слёз.*
*Маці, якіх мы шануем так мала,*
*Сёння б да самае хаты давёз*
*Ад аўтастанцыі, дзе сустракала...* (338)

"Я перастаў саромецца слёз"

Страта дарагога чалавека прыносіць адчуванне непатрэбнасці і непрыкаянасці – родны дом маленства робіцца чужым: *"Без маці дом, як без душы..."* (132). Такое ж семантычнае напаўненне набывае вобраз маці і ў паэзіі іншых прадстаўнікоў філалагічнага пакалення (Р.Барадуліна: "Мамы не стала – не стала Радзімы", В.Зуёнка: "Без мамы вёска – не пазнае сына"), дзе ён канцэптуалізуецца, выступае сімвалам духоўнай повязі з радзімай.

Другая іпастась жанчыны – Каханая, вобраз якой ці не самы значны ў творчасці Р. Тармолы-Мірскага. Гэты аўтар – адзін з нямногіх шасцідзесятнікаў, хто стала працуе ў жанры інтымнай лірыкі. Яшчэ зборнікам "Міранка" (1971) Р. Тармола засведчыў сябе як паэт кахання – шчаслівага і трывожнага, узаемнага і безадказнага, чыстага і ўкрадзенага... Каханне, паводле Р. Тармолы, гэта "вайна" дваіх, таму ён заўсёды імкнуўся не толькі раскрыць пачуццё з пункту гледжання мужчыны, але і спрабаваў зразумець жаночае сэрца: "*Вусны ў пару саспелі. / Вочы ў час расцвілі. / Дзе ж той, што самы смелы, / Пойдзе побач калі? / Дзе ён, што самы любы, / Лепшы на ўсёй зямлі? / Не пераспелі б губы, / Вочы б не адцвілі...* (70) ("Вусны ў пару саспелі..."). Жанчына ў яго лірыцы –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чароўная, загадкавая, неспазнаная і заўжды неабходная, патрэбная (“Ад пяшчоты ўсе звады”, “Роспач”, “Жанчыну разглядваем у тэлескоп...”).

Побач з паэтычнымі замалёўкамі, вершамі пра вайну, прысвячэннямі жанчыне ў Р. Тармолы-Мірскага нямала твораў, што ўяўляюць сабой філасофскія *“пранікненні ў сябе самога”*. Ён пераглядае *“адбіткі ўласнага жыцця – / Мільярды метраў кінастужкі”* (375) і разважае пра сваё прызначэнне (“Дні ідуць”, “Адбіткі ўласнага жыцця...”, “Мне так добра ляжаць...”). Варта звярнуць увагу на вобразы кінакадра і кінастужкі, невыпадковыя ў творчасці гэтага аўтара. Яны перайшлі ў паэзію з іншай сферы дзейнасці Р. Тармолы: з 1960-х гадоў ён працаваў на Беларускім тэлебачанні, пазней – на кінастудыі “Беларусьфільм”. Р. Тамола напісаў сцэнары некалькіх дакументальных, дакументальна-мастацкіх стужак (“Людзям сябе пакажы...”, “Я не самотны... Максім Багдановіч”, “А мае міране добрыя людзі”) і тэлеспектакля (“Зачараваны Валерка”), быў удзельнікам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі тэлевізійных фільмаў. Таму і сустракаюцца ў вершах “прафесійныя” вобразы, выкарыстоўваецца “кінематаграфічны” прыём: разлічаная на зрокавае ўздзеянне фіксацыя карцін і з’яў наваколля суправаджаецца “закадравым”, схаваным на другім плане аналізам.

Да твораў роздумнага характару Р. Тармола-Мірскі ўсё часцей звяртаецца ў эпоху “пераходнага перыяду” – значную частку зборнікаў “Толькі б дагаварыць...” (1986), “У прадчуванні святла...” (1992) складаюць вершы філасофскага зместу. Медытатыўнасць, самааналіз, філасафічнасць у іх нярэдка спалучаюцца з публіцыстычнымі інтанацыямі: паэт занепакоены станам краіны на новым гістарычным раздарожжы (“Няма ніякае пагоні...”, “Нібы галодныя ваўкі”, “Тысячагоддзе”). Творца разважае над мінулым, сучасным і будучым народа і прыходзіць да высновы, што ў самых складаных варунках заставацца сумленным і шчырым яму дапамагла вернасць *“лепшай з дарог”* – паэтычнай (“Карацее твой адрэзак часу...”). Напоўніцу Р. Тармола-Мірскі выявіў талент паэта-філосафа ў лірычнай кнізе – своеасаблівай споведзі самому сабе – “Прычасце” (2000). Тут яшчэ больш паглыбляецца пісьменніцкая рэцэпцыя быцця, што абумоўлена жаданнем спасцігнуць яго законы і таямніцы. У па-мастацку дасканалых вершах-*“душэўных асэнсаваннях”* існасці бачыцца асоба мастака – чалавека з вялікім вопытам і няпростым лёсам. Нягледзячы на ўсе жыццёвыя нягоды, Р. Тармола-Мірскі не толькі не забываецца на Паэзію, але і знаходзіць у ёй духоўнае апірышча і галоўны паратунак: “*Мой паратунак у радках, / Якія і за крок ад смерці / Спрабуюць ад мяне адцерці / Яе няпланавы замах”* [8] (“Мой паратунак у радках...”).

Думаецца, Раман Тармола-Мірскі, аўтар шматлікіх арыгінальных паэтычных кніг не памыліўся, калі абраў для сябе літаратурны шлях. Непасрэднасць, праўдзівасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адкрытасць пісьменніка дапамаглі яго творам пракласці тую *"найцяжэйшую трасу – да сэрцаў людскіх"*. У XXI стагоддзі мастакоўскі набытак "веку дваццатага", будзем спадзявацца, абавязкова ўзбагаціцца новымі знаходкамі.

---

[1] **Тармола-Мірскі Р.** Зярняты з каласоў: Выбранае. – Мінск.: Маст. літ., 1994. С. 42. Далей спасылкі падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем старонкі ў дужках.

[2] **Тармола Р.** Памяць // Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1973. С. 289.

[3] **Лойка А.** Папаўненне // Лойка А. Сустрэчы з днём сённяшнім.– Мінск: Нар. асвета, 1968. С. 145.

[4] **Вярцінскі А.** Штодзённая песня // Вярцінскі А. Высокае неба ідэала: Літ.-крытыч. артыкулы. – Мінск: Маст. літ., 1979. С. 39 – 40.

[5] **Гарэлік Л.** Тармола Раман: Беларускія пісьменнікі: У 6 т. Т. 6. – Мінск: БелЭн, 1995. С. 72.

[6] **Тармола Р.** Памяць // Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1973. С. 288.

[7] **Тамсама.**

[8] **Тармола-Мірскі Р.** Прычасце: Паэзія. – Мінск: Маст. літ., 2000. С. 162.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ